Весці БДПУ. Серыя 1. 2022. № 2. С. 127–132

*УДК 821.161.3.09*

# ЛІТАРАТУРНАЯ САЦЫЯЛІЗАЦЫЯ Ў АПОВЕСЦІ А. ФЕДАРЭНКІ «АФГАНСКАЯ ШКАТУЛКА»

**Л. В. Алейнік,**
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт кафедры гісторыі*
*беларускай літаратуры БДУ*

Паступіў у рэдакцыю 16.02.22.

*UDC 821.161.3.09*

# LITERATURE SOCIALIZATION IN THE STORY BY A. FEDARENKA “AFGHAN BOX”

**L. Aleinik,**
*PhD in Philology, Associate Professor*
*of the Department of History*
*of Belarusian Literature, BSU*

Received on 16.02.22.

У артыкуле разглядаецца адлюстраванне працэсу сацыялізацыі асобы ў мастацкай літаратуры. Прэцэдэнтным тэкстам з’яўляецца аповесць сучаснага беларускага пісьменніка Андрэя Федарэнкі «Афганская шкатулка» (2002), адрасаваная аўдыторыі юных чытачоў. Даследуецца сюжэтабудова твора, выяўляюцца мастацкія прыёмы і сюжэтныя кантэксты, якія спрыяюць літаратурнай сацыялізацыі. Вызначаецца роля мастацкага твора як сацыякультурнай практыкі, якая валодае інтэлектуальным і маральным патэнцыялам, развівае культурную кампетэнтнасць чытача, эфектыўна садзейнічае асэнсаванню грамадскіх каштоўнасцей, засваенню сацыяльных роляў і этыкі міжасабовых узаемаадносінаў. Сцвярджаецца, што мастацкая літаратура з’яўляецца фактарам прадуктыўнай сацыялізацыі асобы.

*Ключавыя словы*: мастацкая літаратура, сацыялізацыя асобы, грамадскія каштоўнасці, маральна-этычныя прынцыпы.

The article considers reflection of the process of socialization in fiction. The precedent text is the story by a modern Belarusian writer A. Fedarenka “Afghan box” (2002) addressed to the audience of young readers. The article studies plot construction of the work, identifies the devices and plot contexts that contribute to literary socialization. It defines the role of a fiction work as social-cultural practice that possesses intellectual and moral potential, develops cultural competence of reader, effectively contributes to realization of social values, learning of social roles and ethics of interpersonal relations. It is asserted that fiction is a factor of productive socialization of a person.

*Keywords:* fiction, socialization of a person, social values, moral-ethic principles.

Першыя дзесяцігоддзі XXI ст. вызначыліся на постсавецкай прасторы відавочнай актывізацыяй увагі да праблем дзіцячай і падлеткавай літаратуры. Пра гэта сведчаць навуковыя канферэнцыі і дзяржаўныя даследчыцкія праекты [1; 2], спецыяльныя рубрыкі ў літаратурна-мастацкіх і навуковых выданнях [3], палемічныя артыкулы і дыскусіі на старонках бягучай перыёдыкі [4; 5]. У 2020 г. часопіс «Детские чтения» адмыслова прысвяціў асобны нумар дыскусіям пра табуяваныя тэмы ў дзіцячай літаратуры [6]. Заклапочанасць вучоных, настаўнікаў, пісьменнікаў і крытыкаў тлумачыцца радыкальнымі зменамі, якія адбыліся ў літаратуры, адрасаванай юным чытачам. Імклівае развіццё інфармацыйных тэхналогій, глабалізацыя камунікацыі, камерцыялізацыя кнігавыдавецкай прадукцыі істотна паўплывалі на рэпертуар дзіцячага чытання – выклікалі масавы попыт на раманы «жахаў», трылеры, меладрамы, фэнтазі і інш. Пачалі нівеляваца межы паміж тэматычна-праблемнымі аспектамі дзіцячай і дарослай літаратуры – у творы для школьнікаў усё часцей уваходзяць сцэны сексуальнага і сямейна-бытавога гвалту, суіцыду, жорсткага здзеку і цкавання ў асяродку аднагодкаў. «Разбалансаванасць сацыяльных інстытутаў, уласцівая постсавецкаму светаўладкаванню, гібрыднасць норм і практык сацыяльных адносін, адсутнасць адзіных крытэрыяў ацэнкі паводзінаў прывялі да таго, што ўяўленні падрастаючага пакалення пра “что такое хорошо и что такое плохо” зрабіліся надзвычай супярэчлівымі. Практыкі ўнармавання, якія прапануюцца разнастайнымі агентамі сацыялізацыі, застаюцца няўзгодненымі» [7, с. 28].

Літаратурная сацыялізацыя – гэта працэс засваення і ўзнаўлення маральных норм, грамадскіх каштоўнасцей і стэрэатыпаў сацыяльных паводзін, увасобленых у сюжэтах і вобразах мастацкіх твораў. Літаратурны тэкст паступова, але няўхільна замацоўвае ў свядомасці чытача псіхалагічныя ўстаноўкі, якія ў пэўнай ступені рэгулююць і каардынуюць яго зносіны з соцыумам. Несумненна, у фарміраванні маральнай культуры асобы мастацкая літаратура здольна адыгрываць самую актыўную ролю. «Культура чытання характарызуецца ўзаемасувяззю рацыянальнага і эстэтычнага. Чытанне – <…> працэс, у якім адначасова адбываецца засваенне новай інфармацыі і ведаў і атрыманне эстэтычнага задавальнення. Працэс чытання патрабуе актыўнай работы думкі і эмацыйнага напружання. Кніга ўводзіць чалавека ў свет інтэлектуальных і духоўных каштоўнасцей, з’яўляецца сродкам гарманізацыі,

сацыялізацыі і інкультурацыі асобы» [8, с. 45]. Адсюль вынікае выключная важнасць ідэйна-эстэтычных і тэматычна-праблемных аспектаў літаратуры, адрасаванай дзіцячай і падлеткавай чытацкай аўдыторыі.

Перад сучаснымі майстрамі прыгожага пісьменства паўстала надзвычай няпростая задача. Пісьменніку важна памятаць, што літаратура для дзяцей не павінна абмяжоўвацца забаўляльнай функцыяй: пажадана, каб яна ўздымала і вырашала маральна-этычныя праблемы, пашырала эрудыцыю, спрыяла прадуктыўнай сацыялізацыі чытача – развівала яго культурную кампетэнтнасць, вытлумачвала законы сацыяльна-грамадскага быцця. І адначасова гэтыя мастацкія творы павінны быць канкурэнтаздольнымі з узорамі вострасюжэтнай камерцыйнай літаратуры. Відавочна, што надзвычай удзячнай глебай, дзе можна нязмушана спалучыць усе пералічаныя якасці, з'яўляецца прыгодніцкі жанр, які ў асяродку юных чытачоў заўжды карыстаўся асаблівай папулярнасцю (прыгадаем, напрыклад, творы Жуля Верна і Фенімора Купера, Янкі Маўра і Уладзіміра Караткевіча). Тлумачыцца гэта найперш тым, што падлетку ўласцівае імкненне да ўсяго нязведанага і небяспечнага, а задаволіць гэтую цікаўнасць і прагу вострых уражанняў дазваляюць менавіта творы прыгодніцкага кшталту. На жаль, сучасныя пісьменнікі да прыгодніцкага жанру звяртаюцца нячаста, фактычна ігнаруючы перспектыўны літаратурны напрамак, які па-ранейшаму застаецца запатрабаваным дзіцячай чытацкай аўдыторыяй. Тым не менш, у айчыннай літаратуры з'яўляюцца асобныя прэцэдэнтныя тэксты, якія дэманструюць патэнцыйныя магчымасці жанру і даюць юным чытачам адказы на складаныя пытанні жыцця – інакш кажучы, выконваюць функцыю літаратурнай сацыялізацыі. Так, напрыклад, адмысловымі ўзорамі ў галіне сучаснай прыгодніцкай прозы (канца XX – пачатку XXI стагоддзя) вызначылася творчасць Андрэя Федарэнкі. Папулярнасцю ў юных чытачоў карыстаецца аповесць «Шчарбаты талер» (1999), шматлікія апавяданні пісьменніка. У 2002 годзе выйшла кніга А. Федарэнкі «Афганская шкатулка», якая даволі хутка стала вядомай у асяродку школьнікаў. Настаўнікі неаднаразова адзначалі, што вучні чытаюць яе без прымусу, з натуральнай цікавасцю, ахвотна абмяркоўваюць на ўроках літаратуры [9]. Паводле бібліятэчнай статыстыкі, у 2019 г. кніга «Афганская шкатулка» ўвайшла ў «шорт-ліст» самых запатрабаваных выданняў дзіцячай літаратуры [10].

Мэта артыкула – прааналізаваць аповесць А. Федарэнкі «Афганская шкатулка», вызначыць мастацкія прыёмы і сюжэтныя кантэксты, якія адыгрываюць ролю ў літаратурнай сацыялізацыі чытача.

Аповесць «Афганская шкатулка» мае традыцыйную для прыгодніцкай літаратуры сюжэтабудову. Нават вонкавы выгляд раздзелаў, да кожнага з якіх маецца своеасаблівая «анатацыя» – пералік асноўных эпізодаў фабулы, − нагадвае прынцып кампазіцыйнага афармлення твораў Янкі Маўра. Падобны прыём пераліку ключавых момантаў цалкам мэтазгодны: адклаўшы кнігу, юны чытач зможа ўзнавіць у памяці падзеі пры наступным звароце да твора. Лаканічныя «анонсы» раздзелаў дазваляюць больш пільна адсочваць паслядоўнасць калізій і логіку іх наступнага развіцця. Тым больш, што аснову твора складаюць не толькі захапляльныя перыпетыі, тайны і загадкі ў жыцці персанажаў, нечаканыя павароты сюжэта, але і скрыжаванні некалькіх падзейных ліній.

Дзейныя асобы аповесці выразна падзяляюцца на дзве ўзроставыя групы – падлеткаў і дарослых. Пралог твора найперш знаёміць з дарослымі. Тут аўтар выкарыстоўвае прыём так званага сугестыўнага ўздзеяння на чытача. Сітуацыя разгортваецца ў палаце Падольскага ваеннага шпіталю, дзе з'яўляецца знявечаны Афганскай вайной салдат: «Прасціну сцягнулі і асцярожна пачалі перакладаць на ложак тое, што пад ёй знаходзілася... Гэта быў увесь у бінтах і ў гіпсе абрубак. У яго не было адной нагі і па плечы абедзвюх рук. Круглая, як шар, галава цалкам забінтаваная – з бінтоў выглядаў толькі нос, каб дыхаць, і рот, каб есці» [11, с. 4]. Фізічны стан героя выклікае не толькі спачуванне, але фактычна шокавае ўражанне і гэтым самым магнетычна прыцягвае ўвагу да сюжэта, інтрыгуе, вымушае суперажываць, абвастрае эмацыянальную ўспрыемнасць.

Эфектыўна ўплывае на псіхалогію чытача і апавядальны прыём прамога аўтарскага звароту, дзе шматабяцальна прагназуецца перспектыва разгортвання загадкавых падзей. Перарываючы гісторыю на загадкавым эпізодзе – калі скалечаны салдат перад смерцю шэптам перадае земляку нейкую таямнічую інфармацыю, – апавядальнік непасрэдна звяртаецца да ўяўнай аўдыторыі: «Вось тут перапыняецца нашая гісторыя. Усплыве яна аж праз адзінаццаць гадоў і на гэты раз месцам дзеяння выбера не далёкі Афганістан і не падмаскоўны Падольск, а беларускую вёску Вялікая Паляна; менавіта тут з'явяцца перад намі, як на экране тэлевізара, і старыя знаёмыя героі, і зусім новыя; менавіта тут наша таямнічая заблытаная гісторыя паступова раскруціцца, разблытаецца і пад канец ператворыцца проста ў гісторыю. Аднак не будзем забягаць наперад!» [11, с. 8]. Гэты прыём забяспечвае стварэнне ілюзіі «спрычыненасці» да сюжэтных падзей, дазваляе чытачу адчуваць сябе калі не «змоўшчыкам», то своеасаблівым «саўдзельнікам» сюжэтнага дзеяння.

УМНБДПУ

Уводзячы чытачоў у кола персанажаў-падлеткаў, аўтар падкрэслівае іх «звычайнасць»: гэта такія самыя школьнікі, як і тыя, што чытаюць кніжку. Фактычна кожны чытач мае магчымасць нязмушана ідэнтыфікаваць герояў з кімсьці са сваіх равеснікаў – сяброў, знаёмых, аднакласнікаў – або знайсці падабенства ўласна з самім сабой. Такая «асабістасць» успрымання твора, як вядома, дадатковы стымул для зацікаўленага чытання. Даследчыкі літаратуры заўважаюць, што лепшым узорам сучаснай прозы для школьнікаў уласціва менавіта «максімальная набліжанасць да рэальнасці, да сацыяльных працэсаў сучаснага жыцця», гэтыя творы «адлюстроўваюць сапраўдныя праблемы дзяцей, звязаныя з іх узроставымі асаблівасцямі, на прыкладзе героя-равесніка паказваюць магчымыя шляхі самарэалізацыі асобы, прымальныя і паспяховыя мадэлі паводзінаў у паўсядзённым жыцці і ў экстрэмальных сітуацыях» [12, с. 46].

Можна сцвярджаць, што тыповасць персанажаў, іх спецыфічная пазнавальнасць – мастакоўскі прыём, накіраваны на заахвочванне юнага чытача. Але неабходна падкрэсліць, што, стварыўшы тыповыя вобразы падлеткаў, А. Федарэнка здолеў у роўнай меры прадэманстраваць іх індывідуальнасць, адметныя рысы характараў, рэалістычна раскрыць эвалюцыйную дынаміку светапогляду юных герояў.

У вобразах Ціма і Валіка ўвасоблены два асноўныя тыпы школьнікаў-падлеткаў. Іх сяброўства – гэта той выпадак, пра які прынята казаць «супрацьлегласці сыходзяцца»: «Дужа яны розныя. Адзін любіць простае, будзённае, другі – толькі штосьці незвычайнае. Цім – гэта неба, а Валік – зямля» [11, с. 18]. Цім – няўрымслівы рамантык, схільны бачыць загадкавае ва ўсім, завадатар у гульнях і прыгодах. Характар хлопчыка раскрываюць не толькі прамыя аўтарскія характарыстыкі, але і яркія дэталі, сэнсава-ёмістыя эпізоды: запіскі сябру Цім піша спецыяльным шыфрам, сярод школьных дысцыплін хлопчык з найбольшай ахвотай вывучае геаграфію – навуку пра далёкія краіны і цікавыя прыродныя працэсы, а ў незнаёмым барадатым чалавеку, на якога ніхто не звярнуў увагі, ён адразу ж западозрыў злачынцу. Валік – ураўнаважаны «хатні» хлопчык, які аднолькава паспяхова вучыцца па ўсіх прадметах. Да фантазій сябра, аматара вышукова-следчых дзеянняў, ён заўжды ставіцца з доляй скепсісу, бо «ёсць тысячы цікавых спраў акрамя “расследаванняў”. У тым жа лесе на лыжах пакатацца, з трампліна на лыжах паскакаць. Хакей, шахматы, хутка камп’ютэры ў школе паставяць – новая забаўка... А то проста тэлевізар паглядзець – хутка Новы год, зімовыя канікулы, столькі розных перадач цікавых, хоць ты з ранку да вечара глядзі...» [11, с. 25].

Відавочная розніца характараў не перашкаджае сяброўству хлопчыкаў: Валік, хоць спачатку і спрабуе лагічна абвяргаць довады Ціма наконт чарговай авантурнай задумы, урэшце амаль заўсёды пагаджаецца скласці кампанію сябру ў чарговых прыгодах. Факт гэтай еднасці, несумненна, мусіць належным чынам тлумачыцца ў творы. Бо інакш узнікае ўяўленне пра «няроўнасць» адносінаў, дзе адзін – лідар, а другі – падначалены. Такая расстаноўка пазіцый не ўласцівая сапраўднаму сяброўству. Аўтар абгрунтавана вытлумачае матывы паводзін Валіка, псіхалогію падлетка: «Ён успомніў, як учора не забіў гол, а Цім суцяшаў яго – адзіны з усёй каманды. Прыгадалася, як у тым годзе хварэў, а Цім кожны дзень прыходзіў да яго ў адведкі, расказваў, што новенькага ў школе, увогуле ў вёсцы... І яшчэ многа рознага дабра ўспомнілася, якое сябар яму рабіў. Ніколі ні на што не крыўдзячыся. Усё даруючы. А ён, Валік? Разныўся тут – “засмяюць”, “па міліцыях зацягаюць”... Мужчына называецца. Будучы салдат, абаронца Беларусі, які баіцца ўвязвацца ў гісторыю; а гісторыя ж і сапраўды цікавая! Чаму б за гэтым барадачом і не прасачыць? Чаму б не разнюхаць, што за ён? Каго хавае ў леснічаўцы?» [11, с. 27]. Праблема сяброўства, сяброўскіх узаемаадносінаў, як вядома, выключна актуальная для падлеткаў. Прыведзены эпізод адначасова выконвае сэнсаўтваральную і выхаваўчую функцыі: не толькі паглыбляе ўяўленне пра характары персанажаў, але раскрывае разуменне хлопчыкам маральнага абавязку, сумленнасці, уласна самога сяброўства. Педагог і псіхолаг Л. Беленькая адзначала: «Адчужаючы” асобную падзею ад мастацкай сістэмы, дзіця разам з тым адчувае яе як самастойнае цэлае. Падзеі ў творы выступаюць як нейкія мікрасветы, што эстэтычна радуюць чытача, нясуць свае пазнавальныя і мастацкія функцыі. У кожным такім мікрасвеце ў розных вузлах сюжэта, у асобных падзейных сітуацыях дзеці імкнуцца знайсці і сфармуляваць свае “сэнсы” [13, с. 120]. Мысленне Валіка ненавязліва дэманструе важнасць узаемападтрымкі ў сяброўстве і ўменне саступаць, знаходзіць паразуменне.

Немалаважным фактарам актывізацыі ўвагі, падтрымкі неаслабнай цікаўнасці чытача з’яўляецца дынаміка разгортвання сюжэта. Пры гэтым абавязковай умовай ёсць рэалістычнасць логікі, верагоднасць прычынна-выніковых сувязей паміж падзеямі. Удзел апавядальніка пазбаўляе гісторыю шматлікіх апісанняў, робіць фабулу максімальна напружанай – напоўненай фактамі, дынамічнай, захапляльнай. Менавіта апавядальнік выконвае ролю своеасаблівага праваднікa ў часе і прасторы, інфармуе чытача загадзя, апярэджваючы доследы герояў. Так, напрыклад, чарговая дзейная персона, загадкавы «барадач», які выклікаў падазрэнне Ціма,

УДПУ

прадстаўляецца задоўга да таго, як будзе «выкрыты» юнымі вышукоўцамі: «...давайце зазірнём у таямнічую хатку-леснічоўку. Паглядзім, што там робіцца, і заадно пазнаёмімся з героем дарослым, які вось ужо два раздзелы нецярпліва прабіваецца на старонкі аповесці, патрабуючы да сябе ўвагі. <...> Пачнём з таго, што назавём імя і прозвішча дзіўнага чалавека – Барыс Крушынскі. Быў ён высокі і дужы. Веку меў гадоў трыццаці... <…> Упершыню аб'явіўся Крушынскі ў ваколіцах Вялікай Паляны ў верасні гэтага года. Купіў у лясніцтва закінутую маленькую хатку, сяк-так прывёў яе да ладу і пачаў жыць. Ніхто не ведаў, хто ён, адкуль, чаму так упадабаў тутэйшыя мясціны, чаму пасяліўся не ў вёсцы <...>, а ў глухім лесе... Загадка! Людзей Барыс Крушынскі ўпарта пазбягаў” [11, с. 28]. Апроч таго, апавядальнік падкрэслівае, што Крушынскі «крута павярнуў сваё жыццё», перабраўшыся на жыхарства ў лес, імкнецца выправіць «ранейшыя памылкі», пачаць жыццё «з чыстага ліста». Інфармацыя вытрымана ў рацыянальных прапорцыях: дадзены пэўныя звесткі пра героя, якія, аднак, не адкрываюць сутнасці – перадумоў, што вымусілі яго «пазбягаць людзей». Такі ход аповеду не толькі не зніжае цікаўнасці, а наадварот – інтрыгуе, абвастрае адчуванне тайны.

Напружанай загадкавасці дадае сюжэту нечаканае здарэнне, якое неўзабаве адбываецца з Крушынскім: падчас палявання ён знаходзіць у лесе непрытомную дзяўчынку, амаль засыпаную снегам. Даволі працяглы час аўтар трымае чытача ў невядомасці, не вытлумачвае прычын і абставін, якія ледзьве не прывялі да трагедыі. Прыём такога ўмоўчвання, утойвання фактаў стымулюе чытача да перманентнай інтэлектуальнай актывізацыі, падштурхоўвае да праверкі ўласных гіпотэз і выштукоўвання новых версій. Калі ж адкрываюцца абставіны, ахвярай якіх зрабілася трынаццацігадовая дзяўчынка Віка, і разгортваецца драматычная гісторыя яе лёсу, у аповесці актуалізуюцца вострыя грамадскія праблемы. Лёс юнай гераіні ў многім тыповы для тысяч дзяцей з сацыяльна неўпарадкаваных сем'яў: «Бацькі ў яе не было, а быў айчым, які больш часу праводзіў па турмах, чым на свабодзе. <…> Не вытрымала маці. <…> Апусцілася, пачала лаяцца, зрабілася раздражнёнай, часцяком таксама спаганяла злосць на дачцэ, нібы тая была вінаватая… <…> Паступова дзяўчынка перастала з'яўляцца дадому. Бадзяжнічала, добра, што верасень быў цёплы. Ні ў якую школу, вядома, не хадзіла. Начавала ў парку на лаўцы, на вакзале, у падвалах, на паддашшах, у кінутых на знос дамах, нават аднойчы ў скірдзе саломы за горадам жыла цэлы тыдзень. Дома яе адсутнасць нікога не трывожыла» [11, с. 65–67].

Па сутнасці, у аповесці «Афганская шкатулка» два сюжэтныя стрыжні, выяўленыя аднолькава выразна. Першы – дэтэктыўная гісторыя з пошукам скарба, другі – гісторыя лёсу дзяўчынкі. Абедзве сюжэтныя лініі ўшчыльную набліжаны і няўхільна выводзяць чытача ў сферу праблем этыкі і маралі. У адным выпадку пытанне маральнага вобліку асобы і чалавечай годнасці вырашаецца ў коле «дарослых» персанажаў, у другім – у асяродку падлеткаў. Неабходна адзначыць, што маральна-этычныя праблемы актуалізуюцца зусім нязмушана, не паслабляючы сюжэтнай інтрыгі, наадварот, пасвойму ўзмацняючы і завастраючы яе. Разважаючы пра ідэйны змест літаратуры, пра яе ўплыў на духоўны свет чытача, рускі вучоны і асветнік М. Рубакін ставіў перад мастацкімі творамі пэўныя пытанні: «Што ты, кніга, можаш даць мне, асобе чалавечай, мне – такому, які я ёсць, майму розуму, майму пачуццю, майму жыццю, барацьбе, якую я вяду, працы, якую я раблю ці маю намер рабіць, у тых умовах, у якія мяне паставіў шчаслівы альбо злаўмысны лёс? <…> І якія перамены ты плануеш і можаш прыўнесці ў маё і ўвогуле чалавечае жыццё? Якія твае намеры, мэты і сродкі? Мне, асобе чалавечай, далёка не абыякава, які адказ ты дасі не ўсе гэтыя пытанні» [14, с. 130–131]. Аповесць А. Федарэнкі перадусім арыентуе юнага чытача ў складаных варунках чалавечых узаемаадносінаў, матывуе да пошуку выйсця з няпростых сітуацый, прапануе альтэрнатыўныя рашэнні і нахняе аптымізмам.

Калі шляхі Крушынскага і Вікі, Ціма і Валіка ўрэшце перакрыжоўваюцца, адбываецца іх знаёмства, спакваля пачынаюць адкрывацца таямніцы. Асобныя сюжэтныя звенні сплятаюцца ў шчыльны ланцужок фактаў, дзе кожны эпізод займае сваё дакладнае месца. Неабходна падкрэсліць, што аўтар па-ранейшаму пільна захоўвае логіку фактаў і абгрунтавана вытлумачае ўчынкі персанажаў. Зусім верагоднай, напрыклад, выглядае гісторыя скарба – шкатулкі з каштоўнасцямі, якая патрапіла з Афганістана ў Беларусь з грузам «Дзвесце» (у закрытай цынкавай труне), пра якую перад смерцю паведаміў калісьці ў Падольскім шпіталі скалечаны салдат. Не пазбаўлены праўдападабенства і другарадныя перыпетыі, што спадарожнічаюць асноўным сюжэтным падзеям. Але галоўнае – чытач літаральна ўвачавідкі назірае натуральную эвалюцыю светапогляду і мыслення персанажаў. Многія якасці характараў не былі зададзены першапачаткова, яны сфарміраваліся на вачах у чытача, па меры таго, як хлопчыкі праходзілі школу жыцця, рабілі выбар у тых ці іншых сітуацыях. Іх высакародныя ўчынкі не выглядаюць выпадковымі, выклiканымі збегам абставінаў ці неверагодных здольнасцяў, яны – вынік усведамлення падлеткамі сваёй адказнасці за лёс іншых людзей, вынік унутранага сталення юных герояў.

Аўтар рэалістычна адлюстраваў тыя акалічнасці, што паступова ўплывалі на свядомасць дзяцей і пазней зрабіліся арыенцірамі ў дзеяннях. Найперш – гэта досвед самога Крушынскага: «Перабудова, канец Савецкага Саюза, вольны бізнес, лёгкія грошы, вясёлае, не вядомае раней жыццё… <…> Васіля наперабой завуць у розныя фірмы, абяцаюць залатыя горы. Пачаў ён з целаахоўніка, затым вырас да менеджара, потым – да камерцыйнага дырэктара… Грошы шалёныя, замежныя паездкі, рэстараны, іншамаркі… <…> Вельмі хутка пайшлі ў Васі няўдачы. Сяброў у яго не было; там, дзе працуюць вялікія грошы, сяброў ніколі не бывае. Сям'ёю ён не абзавёўся. Пасады свае пагубляў, прычым у зваротным парадку: камерцыйны дырэктар – менеджар – целаахоўнік – проста вартаўнік, пакуль не выгналі зусім. Пачаў наш Васіль піць, прадаў усё, што можна было… А тут яшчэ звалілі на яго нейкую махінацыю, з камп'ютэрнай тэхнікай звязаную, падставілі яго, і хоць следчыя разабраліся, што ён тут ні пры чым, аднак месяцы тры давялося пакачацца на нарах…» [11, с. 107–108]. Рэалістычная гісторыя, якую герой расказвае падлеткам пра свайго знаёмца Васіля, што не толькі не займеў шчасця праз грошы, але наадварот страціў спакой і нажыў ворагаў (як высвятляецца пазней – гэта гісторыя лёсу самога Крушынскага), у вялікай ступені паўплывала на свядомасць падлеткаў. Неабходна падкрэсліць, што Крушынскі для іх – герой, аўтарытэтны старэйшы сябар, а яго асабісты прыклад, меркаванні і ацэнкі сітуацый – амаль узорныя, на якія хацелася б арыентавацца ў паводзінах. Таму гісторыя, што ён распавёў, робіцца своеасаблівым эталонам для юных герояў у наступных дзеяннях.

Падкрэсліваючы міждысцыплінарны характар праблемы сацыялізацыі, сучасныя вучоныя заўважаюць: «Вывучэнне сацыялізацыі дзяцей і падлеткаў патрабуе абагульнення і сістэматызацыі. Развіццю гэтага напрамку магла б паспрыяць інтэграцыя навуковых ведаў з розных галінаў навукі – педагогікі і псіхалогіі, літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі, лінгвістыкі і інш.» [15, с. 88]. Мастацкая літаратура, несумненна, адыгрывае выключна важную ролю ў фарміраванні светапогляду юных чытачоў, вызначэнні іх маральна-этычных арыенціраў, каштоўнасных прыярытэтаў. Вядома, што сюжэты літаратурных твораў, якія вылучаюцца верагоднасцю, жыццёвай праўдзівасцю, вымушаюць чытачоў прайсці своеасаблівы «зваротны шлях» – ад літаратурнага твора да сапраўднасці, «робячыся адным з інстытутаў сацыялізацыі ці, дакладней, сацыяльных інстытутаў культуры, праз якія <…> распаўсюджваюцца сацыякультурныя сэнсы, каштоўнасці і нормы ў форме знакавай інфармацыі» [16, с. 117]. Інакш кажучы, знаходзячыся ў атмасферы захапляльных перыпетый сюжэта, чытач непасрэдна далучаецца да іх, нязмушана і, магчыма, неўсвядомлена суадносіць свае адчуванні з пачуццямі персанажаў літаратурнага твора, пранікае ў іх эмацыянальныя станы. Таму ён непазбежна адчуе грэблівасць да адмоўных персанажаў аповесці: былога камандзіра, што служыў з Крушынскім у Афганістане і які ператварыўся ў сквапную істоту, да меркантыльнага доктара Пратасевіча і яго зяця, апантаных прагай нажывы, іншых. А вось станоўчыя героі – Крушынскі, Цім, Валік – якія клапоцяцца пра слабых і пакрыўджаных, імкнуцца да справядлівасці, цярпліва пераадольваюць цяжкасці і небяспечныя абставіны, кіруючыся адно альтруістычным памкненнем дапамагчы бліжняму, абавязкова выклічуць у чытача сімпатыю, жаданне быць падобным да іх. У гэтых вобразах – магутны выхаваўчы зарад, але дыдактычны пачатак замаскаваны, схаваны за перыпетыямі сюжэта, таму ўздзейнічае на чытача апасродкавана, не выклікаючы супраціву. Апроч таго, супрацьпастаўленне персанажаў, якія знаходзяцца на дыяметральна розных этычных пазіцыях, паступова выяўляе, што ключавымі якасцямі станоўчых герояў з'яўляюцца якасці духоўныя – міласэрнасць, спагада, дабрыня. Менавіта гэтыя якасці дапамагаюць героям выходзіць пераможцамі з разнастайных складаных сітуацый. Такім чынам, аповесць А. Федарэнкі «Афганская шкатулка» не толькі адлюстроўвае механізм сацыялізацыі асобы, але з'яўляецца яго непасрэдным фактарам – эфектыўна спрыяе асэнсаванню грамадскіх норм і каштоўнасцей, засваенню сацыяльных роляў і этыкі міжасабовых узаемаадносін.


### Літаратура

1. *Барковская, Н. В.* Взрослые проблемы детской литературы (научно-практический семинар "Детская литература сегодня" УрГПУ, март 2010) / Н. В. Барковская // Филологический класс. – 2010. – № 1(23). – С. 70–71.
2. Чтение как искусство: герменевтический аспект / Беднякова Ю. И. [и др.]. – Киров : Радуга-Пресс, 2013. – 470 с.
3. *Запартыка, Ж. У.* Сучасная беларуская дзіцячая літаратура як прадмет абмеркавання на старонках літаратурных выданняў / Ж. У. Запартыка // Бібліяпанарама: інфармацыйна-аналітычнае выданне. – 2009. – Вып. 14. – С. 63–65.

### References

1. *Barkovskaya, N. V.* Vzroslye problemy detskoj literatury (nauchno-prakticheskij seminar "Detskaya literatura segodnya" UrGPU, mart 2010) / N. V. Barkovskaya // Filologicheskij klass. – 2010. – № 1(23). – S. 70–71.
2. Chtenie kak iskusstvo: germenevticheskij aspekt / Bednyakova Yu. I. [i dr.]. – Kirov : Raduga-Press, 2013. – 470 s.
3. *Zapartyka, Zh. U.* Suchasnaya belaruskaya dzicyachaya litaratura yak pradmet abmerkavannya na staronkah litaraturnyh vydannyaw / Zh. U. Zapartyka // Bibliyapanarama: infarmacyjna-analitychnae vydanne. – 2009. – Vyp. 14. – S. 63–65.

4. *Бязлепкіна, А.* Дарослая дапамога дзіцячай літаратуры: як пісаць, рэкламаваць і выкладаць літаратуру для дзяцей / А. Бязлепкіна // Маладосць. – 2011. – № 9. – С. 116–121.
5. Экстрэмальна небяспечны занятак: дзіцячая літаратура: стан, перспектывы: дыскусія / Л. Сінькова [і інш.] // Полымя. – 2014. – № 12. – С. 137–156.
6. Детские чтения. – 2020. – Том 17. – № 1.
7. *Литовская, М. А.* «Время всегда хорошее»: социальная психология для современного подростка / М. А. Литовская // Детская литература сегодня. – Екатеринбург : 2010. – С. 25–34.
8. *Перцовская, Р. Ф.* Культура чтения как основа интеллектуального развития общества / Р. Ф. Перцовская // Чтение как система трансляции духовного и культурного опыта / М-лы Всероссийской конференции, Санкт-Петербург, 11–12 ноября 2008 г. – СПб.: РНБ, 2009.
9. *Верціхоўская, М.* Платонаўскі эйдас, або Якія кніжкі чытаюць дзеці / М. Верціхоўская, В. Верціхоўская // Маладосць. – № 6. – 2005. – С. 104–117.
10. *Николаева, Н.* Сумеет ли книга выдержать конкуренцию с гаджетами? / Н. Николаева // Звязда. – 2019. – 27 чэрвеня. – С. 8.
11. *Федарэнка, А. М.* Афганская шкатулка: Аповесць, апавяданні / А. Федарэнка. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2009. – С. 3–176.
12. *Кутейникова, Н. Е.* Формирование читательской компетенции школьника. Детско-подростковая литература XXI века / Н. Е. Кутейникова, С. П. Оробий. – М. : Просвещение, 2016. – 220 с.
13. *Беленькая, Л. И.* Социально-психологическая типология читателей-детей (тип читателя, переходный от детского к подростковому) / Л. И. Беленькая // Социология и психология чтения. – М. : Книга, 1979. – Т. 15. – С. 102–121.
14. *Рубакин, Н. А.* Среди книг / Н. А. Рубакин // Избранное: в 2-х т. – М. : Книга, 1975. – Т. 1. – С. 107–210.
15. *Чудинова, В. П.* Литературная социализация детей и подростков: негативные процессы / В. П. Чудинова // Социологические исследования. – 1992. – № 2. – С. 83–89.
16. *Садриева, А.* Социализирующее воздействие произведений о становлении личности на читателя-подростка (на примере романа воспитания) / А. Садриева // Детские чтения. – 2012. – № 1 (001). – С. 117–130.

4. *Byazlepkina, A.* Daroslaya dapamoga dzicyachaj litaratury: yak pisac’, reklamavac’ i vykladac’ litaraturu dlya dzyacej / A. Byazlepkina // Maladosc’. – 2011. – № 9. – S. 116–121.
5. Ekstremal’na nebyaspechny zanyatak: dzicyachaya litaratura: stan, perspektyvy: dyskusiya / L. Sin’kova [i insh.] // Polymya. – 2014. – № 12. – S. 137–156.
6. Detskie chteniya. – 2020. – Tom 17. – № 1.
7. *Litovskaya, M. A.* «Vremya vsegda horoshee»: social’naya psihologiya dlya sovremennogo podrostka / M. A. Litovskaya // Detskaya literatura segodnya. – Ekaterinburg : 2010. – S. 25–34.
8. *Percovskaya, R. F.* Kul’tura chteniya kak osnova intellektual’nogo razvitiya obshchestva / R. F. Percovskaya // Chtenie kak sistema translyacii duhovnogo i kul’turnogo opyta / M-ly Vserossijskoj konferencii, Sankt-Peterburg, 11–12 noyabrya 2008 g. – SPb.: RNB, 2009.
9. *Vercihowskaya, M.* Platonawski ejdas, abo Yakiya knizhki chytayuc’ dzeci / M. Vercihowskaya, V. Vercihowskaya // Maladosc’. – № 6. – 2005. – S. 104–117.
10. *Nikolaeva, N.* Sumeet li kniga vyderzhat’ konkurenciyu s gadzhetami? / N. Nikolaeva // Zvyazda. – 2019. – 27 chervenya. – S. 8.
11. *Fedarenka, A. M.* Afganskaya shkatulka: Apovesc’, apavyadanni / A. Fedarenka. – Minsk : Litaratura i mastactva, 2009. – S. 3–176.
12. *Kutejnikova, N. E.* Formirovanie chitatel’skoj kompetencii shkol’nika. Detsko-podrostkovaya literatura XXI veka / N. E. Kutejnikova, S. P. Orobij. – M. : Prosveshchenie, 2016. – 220 s.
13. *Belen’kaya, L. I.* Social’no-psihologicheskaya tipologiya chitatelej-detej (tip chitatelya, perekhodnyj ot detskogo k podrostkovomu) / L. I. Belen’kaya // Sociologiya i psihologiya chteniya. – M. : Kniga, 1979. – T. 15. – S. 102–121.
14. *Rubakin, N. A.* Sredi knig / N. A. Rubakin // Izbrannoe: v 2-h t. – M. : Kniga, 1975. – T. 1. – S. 107–210.
15. *Chudinova, V. P.* Literaturnaya socializaciya detej i podrostkov: negativnye processy / V. P. Chudinova // Sociologicheskie issledovaniya. – 1992. – № 2. – S. 83–89.
16. *Sadrieva, A.* Socializiruyushchee vozdejstvie proizvedenij o stanovlenii lichnosti na chitatelya-podrostka (na primere romana vospitaniya) / A. Sadrieva // Detskie chteniya. – 2012. – № 1 (001). – S. 117–130.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ